ЗВЯРТАЕМСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

# ПАМЯЦЬ

У 55-м нумары ад 9 мая 1986 года раённая газета «Шлях Кастрычніка» пад загалоўкам «У вогненны час» надрукавала нашы ўспаміны аб барацьбе народных мсціўцаў у тыле ворага ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У ім адзначалі, што партызанскі рух на Хоцімшчыне пачынаўся з вёскі Гута, якой няма ўжо на карце раёна. Там загінулі нашы сябры па зброі, там змагаліся з ворагам нашы верныя памочнікі — сувязныя.

Таму мы зноў звяртаемся да гэтай тэмы з мэтай захаваць у памяці народнай і назву першай партызанскай вёскі і імёны патрыётаў.

У 18 кіламетрах ад г. п. Хоцімска ў лесе за Міхалінам сярод балот існавала невялікая беларуская вёсачка Гута, а непадалёк ад яе хутар Камянец (мясцовыя жыхары называлі яго Прусы). Стаялі яны на шляху да вялікай вёскі Батаева, дзе размяшчаўся варожы гарнізон да 70 чалавек.

З першых дзён акупацыі ў Гуце і вакол яе пачалі стварацца партызанскія групы, перарастаючыя затым у атрады народных мсціўцаў. Хутарскае поле Камянца ператварылася ў партызанскі аэрадром, на якім па ўмоўных сігналах у начны час прызямляліся самалёты з «Вялікай зямлі».

На Гуце трывала заснаваліся дыверсійныя і разведвальныя групы з атрадаў Яроміна, Скандзілава, Антоненкі і другіх, названых пасля «Бясстрашны», «За Савецкую Беларусь» і «Бальшавік», якія ўваходзілі ў 5-ю Клятнянскую партызанскую брыгаду. Яна кантралявала ўвесь участак чыгункі Камунары-Сураж і дарогу Касцюковічы-Хоцімск.

У мэтах бяспекі ў Міхаліне і Камянцы пастаянна выстаўляліся дазоры, а мост цераз лясную рачулку па дарозе на Гуту быў спален, каб перагарадзіць шлях ворагу да цэнтра партызанскай зоны. Гарнізон немцаў і паліцаяў у Батаеве вельмі ўскладняў і скоўваў дзеянні партызан. Сіламі атрада пад камандаваннем Фёдарава восенню 1942 года гэты варожы гарнізон быў разбіт.

На ўсё жыццё запомнілася сакавіцкая раніца 1942 года, калі буйныя сілы гітлераўцаў зрабілі наступленне на мясцовых партызан. Гута аказалася ў варожым кальцы, уварваўшыся ў яе, карнікі захапілі двух яшчэ зусім маладых партызан, якія знаходзіліся тут на вылячэнні пасля моцнага абмарожання. Іх расстралялі прама ва двары, дзе іх прытуліла і лячыла мясцовае насельніцтва, бо не выдалі народныя мсціўцы сваіх баявых сяброў і жыхароў, з якімі падтрымлівалі сувязь. Яны выбралі смерць, а не здраду. Пазней высвятлілася, што загінуўшымі аказаліся афіцэр Чырвонай Арміі камуніст Сцяпан Васільевіч Якубоўскі і камсамолец Сабакін, імя якога засталося невядомым. Яны пахаваны паблізу месца гібелі.

Летам 1943 года паліцэйскім гарнізонам з Хоцімска была зроблена спроба прабрацца у Гуту, аднак зрабіць гэта карнікам не ўдалося, бо сустрэліся з надзейным партызанскім заслонам.

6-га ліпеня гітлераўскае камандаванне вымушана было зняць асобныя франтавыя часці і кінуць іх супраць партызан. Лясы Хоцімскага і Касцюковіцкага раёнаў былі блакіраваны. Фашыстам удалося прарвацца ў Гуту.

Вялікую дапамогу аказваў партызанам жыхар Гуты Дзмітрый Карпавіч Піліпенка, які ўдзельнічаў у перабросцы народных мсціўцаў пры змене імі месц базіравання. Цесная сувязь падтрымлівалася намі з Афанасьяй Дзмітрыеўнай Лаўровай, Х. А. Лаўровым, А. Н. Рафеенка і другімі.

Набліжаецца 42-я гадавіна Вялікай Перамогі. Але вайна не забываецца. Страшную памяць пакінула яна. І мы, ветэраны вайны, былыя ўдзельнікі партызанскага руху на Хоцімшчыне, лічым, што было б справядлівым **увекавечыць памяць аб вёсцы Гута, устанавіць на месцы, дзе яна была, помнік з імёнамі загінуўшых у ёй герояў-партызан.**

**А. ШЫРОКАЎ,**
**былы камандзір узвода разведкі 5-й Клятнянскай партызанскай брыгады.**

**П. ШАЎЦОЎ,**
**былы партызан-разведчык, 5-й Клятнянскай партызанскай брыгады.**

**Шырокаў, А. Памяць** : стварэнне партызанскіх груп у в. Гута / А. Шырокаў, П. Шаўцоў // Шлях Кастрычніка. — 1987. — 11 красавіка. — С. 2.